**Important Bird Area:** Biarezinski zapaviednik






© И. Бышнёв

**Code:** BY005

**Central coordinates:** 54°38 N 28°21 E

**Location:** Vitebskaya voblast: Dokshitsi region, Lepel region, Minskaya voblast: Barysau region

**Area:** 85036 ha

**IBA Criteria:** A1, B2

**National conservation status:** Бярэзінскі Дзяржаўны Біясферны Запаведнік

**International conservation status:** ТВП міжнароднай значнасці. У 1993 г Саветам Еўропы тэрыторыя ўключана ў сетку біягенетычных запаведнікаў. У 1995 г. Бярэзінскі Дзяржаўны Біясферны Запаведнік (БДБЗ) узнагароджаны дыпломам Савета Еўропы. Рамсарскае ўгоддзе з 2010 г. (крытэрый 1а). Ключавая батанічная тэрыторыя

## Site description:

Бярэзінскі запаведнік – гэта буйнейшы комплекс хваёвых лясоў, якія перамяжаюцца з верхавымі і нізіннымі балотамі і поймамі рэк. Прыродныя ўмовы запаведніка характарызуюцца некранутым абліччам лясоў і вялікіх сфагнавых балот. Тут захаваліся ўнікальныя ў Еўропе балотныя масівы, агульная плошча якіх складае 50700 гектараў. У паўночнай і цэнтральнай, больш узвышаных частках

запаведніка, пераважаюць пераходныя і верхавыя балоты, сярод якіх размешчаны пакрытыя хваёвым лесам мінеральныя астравы. У паўднёвай частцы запаведніка знаходзяцца буйныя масівы нізінных балот (у тым ліку і ўся пойма Бярэзіны). Сярод лясоў дамінуюць хвойнікі, якія ўтвараюць буйныя масівы. Больш за палову хваёвых лясоў забалочана альбо прымеркавана да верхавых і пераходных балот.

Вялізнае значэнне мае водная сетка запаведніка: рака Бярэзіна, дробныя вадацёкі (рэчкі, ручаі, пратокі), каналы, старыцы, пойменныя вадаёмы, азёры.

Тэрыторыя запаведніка адносіцца да басейнаў рэк Бярэзіна і часткова Эса, якія, у сваю чаргу, адносяцца да Чарнаморскага і Балтыйскага басейнаў адпаведна. Водападзел між імі праходзіць па паўночна-ўсходняй частцы запаведніка. Увогуле, рачная сетка тэрыторыі прадстаўлена 69 рэкамі, галоўнай сярод якіх з’яўляецца Бярэзіна. Яна бярэ пачатак у 45 кіламетрах ад паўночнай аканечнасці запаведніка, даўжыня яе ў межах запаведніка складае 110 км. Рэчышча ракі звілістае, у яе даліне знаходзіцца многа старыц і пойменных азёр. Неабходна адзначыць і буйнейшы прыток Бярэзіны – раку Сергуч даўжынёй у 35 км. Веснавая паводка пачынаецца ў другой палове сакавіка – першай палове красавіка і працягваецца 20-40 дзён.

Усе азёры запаведніка адносяцца да эўтрофнага тыпу і знаходзяцца на стадыі інтэнсіўнага зарастання. Самае буйное з іх – возера Палік (712 гектараў) – уяўляе сабой натуральнае пашырэнне рэчышча Бярэзіны на паўднёвай ускраіне запаведніка.

На тэрыторыі запаведніка знаходзіцца паўднёвы адрэзак штучнай бярэзінскай воднай сістэмы, якая злучае рэкі Бярэзіна і Заходняя Дзвіна. Гэта сістэма адыгрывае пэўную гідралагічную ролю тым, што падтрымлівае ўсталяваны водны рэжым навакольнай тэрыторыі і не аказвае істотнага ўздзеяння на балотныя сістэмы запаведніка.

Сучасная флора запаведніка ўключае больш 2000 відаў раслін, у тым ліку 813 сасудзістых, мохападобных – 216, грыбоў – 463, водарасляў – 317, лішайнікаў – 238. Увогуле па Беларусі назіраецца прыкладная раўнавага паміж халадаўстойлівымі і цеплалюбівымі формамі раслін з невялікай перавагай апошніх, на тэрыторыі ж Бярэзінскага запаведніка менавіта халадаўстойлівыя віды атрымалі найбольшае развіццё. У запаведніку выяўлены тры новыя для Беларусі віды раслін: сухацветка прыземістая *Omalotheca supina*, (знаходзіцца далёка за паўднёвай мяжой арэала), асака заліўная *Carex paupercula*, пузырнік судэцкі *Cystopteris sudetica* (рэліктавы від, у запаведніку існуе ізаляваная папуляцыя).

У Бярэзінскім запаведніку праведзена дыферынцыяцыя тэрыторыі на ўчасткі з розным рэжымам аховы. Усяго створана 6 зон: абсалютна запаведная, буферная, эксперыментальна-гаспадарчая, экскурсійная, ахоўная і гідралагічная. Абсалютна запаведная зона складае 47,2% ад агульнай плошчы запаведніка. Гаспадарчая дзейнасць (сельская гаспадарка) дазволена ў эксперыментальна-гаспадарчай зоне (7000 гектараў). Вакол запаведніка праходзіць ахоўная зона шырынёй 2 кіламетры, якая належыць лясгасам, калгасам і саўгасам. У гэтай зоне забаронены тыя віды гаспадарчай дзейнасці, якія могуць аказаць адмоўны ўплыў на прыродныя комплексы запаведніка. У гідралагічнай зоне, якая працягнулася вакол запаведніка кальцом шырынёй 5 км, забаронены пошукавыя і меліярацыйныя работы.

## Habitats:

Балоты верхавыя і пераходныя – 59,6%, лясы (з улікам на балотах) – 83,3%, азёры – 2%, іншыя землі – 1%.

## Birds:

Фаўністычны спіс Бярэзінскага запаведніка ўключае 234 відаў птушак, з якіх 179 адзначана на гнездаванні, 31 – пралётныя, 14 – залётныя, 6 – зімуюць. Пераважна гэта лясныя і водна-балотныя віды, у меншай ступені – віды адкрытых тэрыторый і населеных пунктаў. На тэрыторыі запаведніка адзначана 58 відаў птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі.

На ТВП “Бярэзінскі запаведнік” мае значэнне для захавання значнай колькасці гняздзяшчыхся пар вялікага арляца *Aquila clanga* і арла-вужаеда *Circaetus gallicus*.

## Other animal groups:

На тэрыторыі запаведніка адзначана 56 відаў млекакормячых, 5 відаў рэптылій, 11 відаў амфібій. Спіс рыб і кругларотых уключае 34 віда.

## Populations of IBA trigger species:

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends (2000-2010) | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Short-toed eagle *Circaetus gallicus* | B | 4-6 breeding pairs | 2008 | Good | ↔ | B2 |
| Hen harrier *Circus cyaneus* | B | + | 2008 | Poor | | |
| Lesser spotted eagle *Aquila pomarina* | B | 15-20 breeding pairs | 2008 | Good | ↔ | |
| Spotted eagle *Aquila clanga* | B | 6-12 breeding pairs | 2008 | Good | ↔ | A1 |
| Osprey *Pandion haliaetus* | P | + | 2008 | Poor | | |
| Jack snipe *Lymnocryptes minimus* | P | + | 2008 | Poor | | |
| Whimbrel *Numenius phaeopus* | B | 2-5 breeding pairs | 2007-2008 | Good | ↑ | |
| Curlew *Numenius arquata* | B | 6-7 breeding pairs | 1995 | Good | ↓ | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends (2000-2010) | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Curlew *Numenius arquata* | B | 0 breeding pairs | 1996-2008 | Good | ↓ | |
| Graet grey owl *Strix nebulosa* | B | 1-2 breeding pairs | 2007-2011 | Poor | ↑ | |

## Other biodiversity:

Звяры: сажалкавая начніца *Myotisdasycneme*, малая вячэрніца *Nyctalusleisleri*, паўночны кажанок *Eptesicusnilssoni*, соня-палчок *Myoxisglis*, садовая соня *Eliomys quercinus*, зубр *Bisonbonasus*, рысь *Lynxlynx*, буры мядзведзь *Ursusarctos*, барсук *Melesmeles*.

Птушкі: чорнаваллёвы гагач *Gavia arctica* (гн), шэрашчокая коўра *Podiceps grisegena* (гн), чапля-бугай *Botaurus stellaris* (гн), чапля-лазянік *Ixobrychus minutus* (гн), вялікая белая чапля *Egretta alba* (зал), чорны бусел *Ciconia nigra* (гн), серый гусь (мг), гусь-піскулька *Anser erythropus* (мг), качка-шылахвостка *Anas acuta* (мг), белавокі нырок *Aythya nyroca* (зал), савук-луток *Mergellus albellus* (мг), даўганосы савук *Mergus serrator* (мг), вялікі савук *Mergus merganser* (мг), арол-маркут *Aquila chrysaetos,* чорны каршун *Milvus migrans* (гн), арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* (гн), сокал-падарожнік *Falco peregrinus,*Сокал-кабец *Falco subbuteo* (гн), пардва *Lagopus lagopus*, сокал-пустальга *Falco tinnunculus* (гн), шэры журавель *Grus grus* (гн), малы пагоніч *Porzana parva* (гн), драч *Crex crex* (гн), дубальт *Gallinago media* (гн), залацістая сеўка *Pluvialis apricaria* (гн), вялікі зуёк *Charadrius hiaticula* (зал), крывок *Haematopus ostralegus* (зал), кулік-селянец *Tringa nebularia* (гн), баталён *Philomachus pugnax* (мг), вялікі грыцук *Limosa limosa* (гн), малая чайка *Larus minutus* (гн), шызая чайка *Larus canus* (мг), белашчокая рыбачка *Chlidonias hybridus* (гн), малая крычка *Sterna albifrons* (мг), пугач *Bubo bubo* (гн), балотная сава *Asio flammeus* (гн), сыч-сіпель *Athene noctua* (гн), вераб’іны сычык *Glaucidium passerinum* (гн), даўгахвостая кугакаўка *Strix uralensis* (гн), сіні сіваграк *Coracias garrulus* (гн), звычайны зімародак *Alcedo atthis* (гн), зялёная жаўна *Picus viridis* (гн), беласпінны дзяцел *Dendrocopos leucotos* (гн), жоўтагаловы дзяцел *Picoides tridactylus* (гн), жаўрук-смяцюх *Galerida cristata* (гн), палявы свірстун *Anthus campestris* (гн), чарналобы грычун *Lanius minor* (зал), садовая стрынатка *Emberiza hortulana*

(гн).

Амфібіі: грабеньчаты трытон *Trituruscristatus*, чаротавая рапуха *Bufocalamita*.

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emysorbicularis*

Рыбы: падуст *Chondrostomanasus*.

Малюскі: тоўстая перламутраўка *Uniocrassus*.

Павукі: вялікі сплаўны павук *Dolomedesplantarius*.

Насякомыя: сібірская лютка Брауэра *Sympectaanulatabraueri*, прыгожая нехаленія *Nehalenniaspeciosa*, рагаты дзедка *Ophiogomphuscecilia*, кольчаты кардулегастэр *Cordulegasterboltonii*, дазоршчык-імператар *Anaximperator*, белавалосае каромысла *Brachytronpratense*, зялёны каромысел *Aeschnaviridis*, караткакрылы мечнік *Conocephalusdorsalis*, звычайны мечнік *Conocephalusdiscolor*, няпарны зелянчук *Crysochraondispar*, сфагнавы вадамер *Gerrissphagnetorum*, рашэцісты жужаль *Carabuscancellatus*, жужаль Менетрые *Carabusmenetriesi*, бліскучы жужаль *Carabusnitens*, фіялетавы жужаль *Carabusviolaceus*, шчыгрынывы жужаль *Carabuscoriaceus*, рабрысты слізняед *Chlaertiuscostulatus*, найшырэйшы плывунец *Dytiscuslatissimus*, двухпалосны падвадзень *Graphoderusbilineatus*, веснавы гнаявік *Geotrupesvernalis*, пустэльнік *Osmodermaeremite*, жук-алень *Lucanuscervus*, валасаты стафілін *Emushirtus*, малое начное паўлінава вока *Eudia pavonia*, крывасмокавая металавідка *Plusiazosimi*, мядзведзіца-гаспадыня *Pericallia matronula*, прыгожы пядзенік *Carabuscancellatus*, блакітнаватая мнагавочка *Carabusmenetriesi*, блакітніца алексіс *Glaucopsychealexis*, буйнавочка *Lopingaachine*, мнемазіна *Parnassiusmnemosine*, альпійская перламутраўка *Clossianathore*, вялікая шашачніца *Euphydryasmaturna*, тарфяннікавая жаўтушка *Coliaspalaeno*, аксамітніца Юта *Oeneisjutta*, мохавы чмель *Bombusmuscorum*, чмель Шрэнка *Bombusschrenckii*, мурашка Форшлюнда *Formicaforsslundi*, тапінома няясная *Tapinomaambiguum*.

Расліны. Усяго 45 відаў, сярод іх: лікападыела заліўная*Lycopodiellainundata*, граздоўнік рамонкалісты*Botrychiummatricariifolium*, граздоўнік многараздзельны *Botrychiummultifidum*, граздоўнік віргінскі*Botrychiumvirginianum*, пузырнік судэцкі *Cystopterissudetica*, мнаганожка звычайная*Polypodiumvulgare*, пярэсна еўрапейская Trolliuseuropaeus, бяроза карлікавая Betulanana, альдраванда пухіраватая *Aldrovandavesiculosa*, расіца прамежкавая*Droseraintermedia*, лінея паўночная*Linneaborealis*, увярэднік скіпетрападобны*Pedicularissceptrum-carolinum*, увярэднік лясны*Pedicularissylvatica*, змеегалоўнік Руйша*Dracocaphalumruyschiana*,

пустапялёснік зялёны*Coeloglossumviride*, ладдзян трохнадрэзаны *Corallorhizatrifida*, венерын чаравічак сапраўдны *Cypripediumcolceolus,* гайнік цёмна-чырвоны *Epipactisatrorubens*, ядрушка даўгарогая *Gymnadeniaconopsea*, хамарбія балотная *Hammarbyapaludosa*, броўнік аднаклубневы *Herminiummonorchis*, ласняк Лёзеля *Liparisloeselii*, тайнік сэрцападобны *Listeracordata*, тайнік яйцападобны*Listeraovata*, асака заліўная*Carexpaupercula*, кастрэц Бенякена *Bromopsisbenekenii*, трышчаціннік сібірскі *Trisetumsibiricum*, цына шыракалістая *Cinnalatifolia* і іншыя.

Водарасці: фрагілярыя аркападобная *Fragilariaarcus,* пинуларыя палёнка *Pinnulariapolyonca,* стэнаптэробія скрыўлёная *Stenopterobiacurvula,* стэнаптэробія пяшчотненькая *Stenopterobiadalicatissima*.

Імхі: лафозія узыходная *Lophoziaascendens*, скапанія завостраная *Scapania apiculata*, цэфалозія стужкавая *Cephalosiacatenulate,* дыкранум зялёны *Dicranum viride*, кобрыум даўгалісты *Paraleucobryumlongifolium*, цыклідыўм стрыгійскі *Cinclidiumstygium*, меезія трохгранная *Meesiatriquerta*, псеўдабрыум цынклідыяпадобны *Pseudobryumcinclidioides*, крыта-гіпнум драбнейшы *Cryto-hypnumminutulum*, псеўдакаліергон дзеразападобны *Pseudocalliergonlycopodioides*.

Лішайнікі: хенатэка зеленаватая *Chaenothecachlorella*, кладонія стройная *Cladoniaamaurocraea*, кладонія дзірваністая *Cladoniacaespitica*, цэтрэлія цэтрарыепадобная *Cetreliacetrarioides*, эвернія распасцёртая *Everniadivaricata*, гіпатрахіна адагнутая *Hypotrchynarevoluta*, меланелія сарэдыёзная *Melanelia sorediata*, менегацыя прасвідраваная *Menegazziaterebrata*, пармеліёпсіс цёмны *Parmeliopsishyperopta*, уснея арагавелая *Usneacertain*, уснея квітучая *Usneaflorida*, рамаліна доўгаваласатая *Ramalinathrausta*, лабарыя лёгачная *Lobariapulmonaria*, пельтыгера пухірыстая *Peltigeraaphthosa*.

Грыбы: лісічка шэрая *Cantharelluscinereus*, спарасіс кучаравы *Sparassiscrispa*, герыцый *Hericiumcoralloides*, сцыцінастрома духмяная *Scytinostromaodoratum*, пікнапорус кінаварна-чырвоны *Pycnoporuscinnabarinus*, банкера чорна-белая *Bankerafuligineoalba*, балетопсіс бела-чорны *Boletopsisleucomelaena*.

## Threats:

Парушэнне спакою птушак, якое ўзмацнілася ў апошнія гады ў сувязі з антрапагенным прэсам з боку турыстаў.

Нерэгламентаваны збор грыбоў і ягад.

Зарастанне хмызняком поймы р. Бярэзіна.

Інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі на прылягаючых да запаведніка тэрыторыях.

## Recommendations for the conservation:

У мэтах захавання біяразнастайнасці неабходна распрацаваць комплексны доўгачасовы план кіравання запаведнікам.

## References:

Богуцкий Ю.В., Богуцкая Т.С. Значение Березинского биосферного заповедника для сохранения редких и исчезающих видов птиц в Беларуси. Заповедное дело в Республике Беларусь: итоги и перспективы: материалы Международной научно-практической конференции, посвященной 85-летию Березинского заповедника, 22-25 сентября 2010 г. п. Домжерицы/ редкол.: В.С. Ивкович (отв. ред.). – Мн.: Белорусский Дом печати, 2010. – с. 17-18.

Богуцкий Ю.В., Лукашук А.О., Медведев И.Г. Виды животных из красной книги Республики Беларусь в Березинском биосферном заповеднике / Биологическое разнообразие Белорусского Поозерья: современное состояние, проблемы использования и охраны: материалы II Международной научно-практической конференции, Витебск, 2008. – с. 21-22.

Богуцкий Ю.В., Богуцкая Т.С. Птицы из Красной книги Беларуси в Березинском заповеднике: современное состояние, угрозы. // Мат. науч.-практ.конф. «Зоологические чтения – 2012», посв. 250-летию проф. С.Б. Юндзилла (1761-1847). Гродно, 01-04.03.2012. Гродно: ГрГМУ – 2012, с. 22-24

Домбровский В.Ч. Динамика численности большого и среднего кроншнепов на верховых болотах Березинского биосферного заповедника // Тезисы докладов VIII Международной научной конференции "Кулики Северной Евразии: экология, миграции и охрана" 10-12 ноября 2009 г., Ростов-на-Дону, 2009, с. 57-58.

Ключевые ботанические территори Беларуси / Под ред. О.М. Масловского, Г.А. Пронькиной. – М.-Мн. -: Бестиор, 2005. – 80 с.

Ивкович Е.Н. Изученность и современное состояние флоры Березинского заповедника. Заповедное дело в Республике Беларусь: итоги и перспективы:

материалы Международной научно-практической конференции, посвященной 85-летию Березинского заповедника, 22-25 сентября 2010 г. п. Домжерицы/ редкол.: В.С. Ивкович (отв. ред.). – Мн.: Белорусский Дом печати, 2010. – с. 38-41

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Бышнёў І.І., Дамброўскі В.Ч., Стаўроўскі Д.Д., Цішачкін А.К.)

http://berezinsky.by

**Authors :** Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*